**Данат Яканюк**
*Беларускі дзяржаўны універсітэт*

# ТРАНСФАРМАЦЫЯ СУТНАСЦІ ЖАНРАВЫХ ПАНЯЦЦЯЎ У СУЧАСНАЙ ТЭЛЕПУБЛІЦЫСТЫЦЫ

Сучасная электронная журналістыка (радыё-, тэле-, вэб-), асабліва электронная публіцыстыка, ужо набыла і вельмі дынамічна набывае якасці і функцыі дзейнасці, якія ўшчыльную звязаны не столькі з працэсам збору, кадзіравання і перадачы ў інфармацыйную прастору фактаў пра стан і рух жыцця, колькі з працэсам псіхалогіі з усімі яе фундаментальнымі праблемнымі разгалінаваннямі (*псіхафізіялагічнай, псіхасацыяльнай, псіхапраксічнай, псіхагнастычнай псіхалогіі*)*. Думаецца, што цяпер гэта амаль рытарычныя пытанні, тым больш, што сама навука псіхалогія – гэта, па сутнасці, славесна-вобразнае, вербальна-лагічнае апісанне псіхічных, псіхафізіялагічных, сацыяльна-псіхалагічных і etc. станаў, чым і займаецца сёння тэлепубліцыст.

Другі факт нашых развааг датычыцца таго, што менавіта *творы мастацтва* і эфірныя каментарыі і тлумачэнні іх і былі першымі жанравымі ўтварэннямі ў тэлепубліцыстыцы. Бо тэлеадаптацыя твораў мастацтва па

---

* Псіхалагічнаму аспекту прафесійнай дзейнасці сучаснага электроннага журналіста былі прысвечаны выступленні аўтара на канферэнцыях: «Психологические аспекты электронной журналистики в условиях мультимедийности» // Материалы международной научной конференции «Журналистика 2006», Москва, 5–8 февраля 2007 г., МГУ; «Электронная журналистика в условиях конвергенции видов массовой коммуникации» // Материалы Всероссийской научно-практической конференции, Москва, 2–6 февраля 2008 г., МГУ.

аб'ёмах была выключна пераважнай у тэлеэфіры з самага пачатку тэлевяшчання ў СССР і, безумоўна, у Беларусі. Так, толькі ў 1955 г. Цэнтральная студыя тэлебачання перадала ў эфір 1764 перадачы, з іх 73 % – мастацкія і 27 % – грамадска-палітычныя, спартыўныя і навукова-пазнавальныя (у тым ліку і рэклама). І гэта статыстыка пацвярджае факт: *тэлевяшчанне ад пачатку было, у асноўным, мастацкім*. Да таго ж у структуры Савета Міністраў СССР і БССР у 50–60-я гады сфера дзейнасці спачатку радыё, а за ім і тэлебачання адносілася да блока «культура». Больш за тое, менавіта ў Міністэрстве культуры было створана (пераўтворана з Камітэта па радыёінфармацыі пры СМ БССР) у 1953 г. спецыяльнае структурнае падраздзяленне – Галоўнае ўпраўленне радыёінфармацыі. Яшчэ ў Маскве, на ЦСТ, у канцы 40-х – пачатку 50-х гг. пачалі фарміравацца і замацоўвацца ў прафесійным лексіконе першасныя жанравыя і тэхнолага-прафесійныя азначэнні тыпаў, відаў, жанраў, формаў тэлевяшчання і тэлежурналістыкі. Гэта *тэхнічныя тэрміны* – «тэлезастаўка», «пазастудыйная» перадача, «ПТС» (перасоўная тэлестанцыя), «тэст-табліца» (настройка тэлекамеры перад эфірам), «тракт», «тэлецэнтр», «тэлестудыя», «тэлетрансляцыя»; *жанравыя формы* – «тэлеперадача», «кінаперадача», «тэлечасопіс», «тэматычная музычная тэлеперадача», «навукова-пазнавальная тэлеперадача», «тэлепастаноўка», «тэлеспектакль», «канцэрт-лекцыя», «фільм-спектакль», «тэлевізійны кіначасопіс», «кінасюжэт» (устаўка ў тэлечасопіс ці інш. т/п).

Трэці наш тэзіс тычыцца таго, што электронны рух часу дэтэрмінаваў неабходнасць сучаснага ўдакладнення і яшчэ нядаўна класічнага азначэння вяршыннай групы жанраў, якая ў большасці маскоўскіх падручнікаў значыцца як «мастацка-публіцыстычныя». На нашу думку, у тэрміне «мастацка-публіцыстычныя жанры» прыхавалася таўталогія. Бо публіцыстыка была і застанецца ў шэрагу *мастацкіх* дэфініцыяў, будзе катэгорыяй *мастацтва публічных (масавых) зносін*. Паняцце «публіцыстыка» ўжо ўтрымлівае сэнс мастацкасці, бо ёсць «красамоўства», што значыць «прыгажосць» або мастацтва* маўлення «на публіцы». І калі мы групуем пэўныя жанры менавіта «з публіцыстычным ухілам», дык маем на ўвазе менавіта той самы *мастацкі адмысловы стыль*, які ёсць ужо мастацтва зносін. Таму частка прыметніка «мастацка-» ў нашым выпадку «залішняя» і была прыменена паводле логікі групавання жанраў журналістыкі як пераважна ідэалагічнай сферы. Да таго ж тагачасныя тэарэтыкі тэлежурналістыкі (60–80-я гг.) аналізавалі, у асноўным, творы эканамічнай, сельскагаспадарчай, грамадска-аналітычнай і сацыяльна-палітычнай тэлепрадукцыі, бо апрыёры быў зададзены ідэалагічны, партыйна-палітычны стрыжань усім гуманітарным даследаванням.

У пацвярджэнне такога даследчага «ўхілу» – чысцюткія лісты «выкарыстання» кожнай папкі архіўнай справы паводле мастацкага дый усяго тэлевяшчання, на якіх кожны з даследчыкаў павінен распісацца. (Аўтар на гэтых лістах у большасці выпадкаў быў першым, хто крануў мікрафонныя папкі мастацкага тэлевяшчання і ў Мінскім, і ў Маскоўскім архівах за паўстагоддзя.)

Такім чынам, трэці, найвышэйшы від журналісцкай дзейнасці і, адпаведна, жанравы блок, пасля блоку тэлефакталогіі («чыстай» інфармацыі) і блоку жанраў тэлеаналітыкі, мы называем коратка і адэкватна рэальнай семантыцы паняцця і зместу журналісцкай дзейнасці: «тэлепубліцыстыка» і, адпаведна, блок «публіцыстычных жанраў». А ў кантэксце канвергенцыі відаў журналісцкай дзейнасці – «электронная публіцыстыка», «электронная журналістыка», «жанры электроннай публіцыстыкі».

* У дадзеным выпадку мастацтва маўлення – гэта ёсць майстэрства красамоўства высокага ўзроўню. Увогуле катэгорыя майстэрства, вынікам якога з'яўляюцца творы высокай эстэтычнай вартасці, натуральна пераходзіць у катэгорыю мастацтва. Гэтыя катэгорыі знаходзяцца ў дыялектычнай повязі, таму як мастацтва без майстэрства немагчыма, як і майстэрства не можа быць ім, калі не дасягае мастацкай – высокаэстэтычнай вартасці. Напрыклад, скрыпкі Страдывары, кампазіцыі Моцарта, архітэктура Росі, прамовы Цыцэрона і т. п.